ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 229 (1196) | ПЯТНІЦА, 3-га кастрычніка 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 .
6 месяцаў . . . 1 р. 80 .
1 год . . . 3 р. 30 .
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25,
сакратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Камсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ Х.

Кошт асобнага № — 2 кап.

УДАРАМ УДАРНЫХ БРЫГАД

ударым па праваопортуністычных малаверах, гультаёх, лятунох, рвачох, ілжэўдарніках—усіх тых, хто перашкаджае выкананьню пяцігодкі

Першы Ўсесаюзны дзень ударніка даў новыя дзесяткі тысяч перадавікоў соцбудаўніцтва—барацьбітоў за пяцігодку

НОВАЯ ХВАЛЯ ТВОРЧАГА ЎЗДЫМУ

Дзень ударніка ў Віцебску

Верасьнёўская адозва ЦК УсеКП(б) аб ліквідацыі прарываў і праведзены ў сувязі з ёю 1-га кастрычніка Ўсесаюзны дзень ударніка выклікалі новую хвалю творчага ўздыму і жаданьня змагацца за пяцігодку ў працоўных Віцебшчыны.

Адразу пасьля зьмяшчэньня адозвы ЦК на ўсіх прадпрыемствах адбыліся мітынгі, на якіх былі прыняты конкрэтныя пастановы для ліквідацыі прарываў другога году пяцігодкі.

Усё новыя і новыя формы працы выяўляюцца ў рабочых колектывах. Побач з грамадзкім буксірам і скразнымі брыгадамі, на фабрыцы „Профінтэрн“ пачынаючы з 25-га на 30-е верасьня праведзены вытворчыя манэўры. У час манэўраў усе фабрычныя організацыі па-баявому паставілі сваю працу на барацьбу з прарывамі. Створаны фабрычныя і цэхавыя штабы па кіраўніцтву манэўрамі.

Фабрыка „Профінтэрн“ правяла геройскую барацьбу з мінулымі прарывамі, напружыўшы ўсе сілы, каб скончыць свае вытворчыя планы. I яна іх скончыла. Нехарыя рабочыя задайнічаюць перад урадам аб узнагародзе лепшага з лепшых, сапраўдных ардэнаганосцаў,—тав. Пятышкіна, і іншых, ордэнам Леніна.

I ня толькі баявыя вытворчыя манэўры. На цэлым шэрагу прадпрыемстваў, раней ня выконваўшых свае планы, зараз ствараюцца новыя і новыя брыгады, праводзіцца вялікая праца з ударнікамі.

На многіх прадпрыемствах выдаюцца спэцыяльныя бюлетэні, якія знаёмяць рабочых з становішчам выкананьня промфінпляну, адзначаюць добрыя і адмоўныя бакі ў працы і заклікаюць к далейшай барацьбе. Такія бюлетэні выдаюцца на фабрыцы „Дзьвіна“, скурзаводзе, на фабрыцы „Профінтэрн“ і інш.

Бюлетэнь скурзаводу—„За выкананьне промфінпляну“—знаёміць рабочых з становішчам выкананьня промфінпляну і адначасова ўказвае:

— „Вось з-за каго наш завод сядзіць на чорнай дошцы“. Далей ідзе сьпіс тых людзей, якія сваёй работай арываюць промфінплян, ставяць свае грашовыя інтарэсы вышэй інтарэсаў заводу.

А гэткія яшчэ ёсьць.

Гэтымі днямі на панчошнай фабрыцы адбыўся паказальна-выхаваўчы суд над групай рабочых, сярод якіх былі комсамольцы: Вігдорчык, Шварцова, Бабаева, Грубін і інш., якія лічылі свае грашовыя інтарэсы вышэй заводзкіх, цікавіліся толькі сваёй кішэняй, налаштоўвалі прагулы і зрывы ў працу. Рабочы колектыў рашуча адмежаваўся ад тых людзей, якія па-скурніцку ставяць і вырашаюць пытаньні дня.

I нібы ў адказ на гэтыя вылазкі, у адказ гэтым шкурнікам, на заводах і фабрыках пракацілася масавая хваля ударніцкага руху.

Новыя чатыры ўдарныя брыгады створаны ў такарным цэху заводу „Чырвоны Мэталіст“, скразныя ўдарныя створаны на ўсіх трох зьменах Лесазаводу № 13. Вялікая колькасьць рабочых панчошна-трыкатажнай фабрыкі, у адказ на вялікую цякучасьць і значныя прагулы, якія мелі месца на фабрыцы, абвясьцілі сябе ўдарнымі і законтрактаваліся да канца пяцігодкі за фабрыкай.

Комсамол Віцебску за ўсёй гэтай барацьбе яшчэ не выхоўваецца, як перадавы атрад энтузіястых. На цэлым шэрагу прадпрыемстваў заўважаюцца вылазкі рвацтва, комсамольцы адыяўляюцца кантрактавацца, ілжэ-ударнічаюць. Але, побач з гэтымі адзінкамі, выяўляюцца і новыя людзі, новыя рабочыя.

Так, на ф-цы „Профінтэрн 1“, створаны комсамольскія брыгады, толькі на ф-цы „Дзьвіна“ моладзь заняла самастойны ўчастак на конвэеры.

30 верасьня, калі скончыла працу большасьць заводаў і фабрык, на вуліцах Віцебску адбылася магутная дэманстрацыя працоўных, прысьвечаная дню ўдарніка. З усіх канцоў гораду, у спэцвопратцы, сьцякаліся магутныя калёны рабочых.

На цэнтральным пляцы адбыўся вялікі мітынг, прысьвечаны дню ўдарніка.

Адначасова комсамол Віцебску правёў лепшых сваіх барацьбітоў на наш гаспадарчы фронт,—на Донбас. Пяць вагонаў стракацілі разьвясёлымі плякатамі і лёзунгамі. Вэ ўсю сьпевы разьліваліся па станцыі і ўносілі нейкі новы бадзёры настрой у ціхую станцыю.

Калі зьнік апошні вагон цягніка, з лёзунгамі „Бывай, Віцебск! Чакай чорнае золата“, „Мобілізацыя на Донбас—практычнае ажыцьцяўленьне адозвы ЦК“, і дэманстранты размясціліся па раёнах,—па ўсіх клюбах і тэатрах адбыліся мітынгі і конфэрэнцыі, прысьвечаныя дню ўдарніка і сканчэньню другога году пяцігодкі.

Л. Глезэр.

Віцебск, 1930 г.

Агляд дасягненьняў і недахопаў

1-га кастрычніка рабочыя Менскай швейнай фабрыкі „Кастрычнік“ сабраліся ў клюбе імя Карла Маркса, каб падлічыць вынікі сваёй працы і становішча фабрыкі к канцу 2-га году пяцігодкі.

Яны толькі што сталі за „Гофманаўскімі“ машынамі, якія паўдарнаму спаборнічаюць на фабрыцы з англійскімі машынамі савецкай конструкцыі — „Чырвонай Вагранкі“. Ім, яшчэ вось толькі-што, дагатыраваныя вярчатыя валы выступалі роўнамерныя тахты, круцячы па некалькі столак сукна, яшчэ ў памяці кожнага рабочага новае трымаецца ўражаньне баявога дня працы. Шум фабрыкі і грукат машын асабліва вызначыліся ў дзень ударніка, і на вечары гэта значна адчувалася.

На гэтым вечары вітаюць лічбы. Яны—конкретныя сухія паказчыкі і сьведчаць аб многім.

Агульны промфінплян па фабрыцы выкананы на 100,88%. На некаторых заданьнях ёсьць перавыкананьне, а на некаторых і недавыкананьне. За 11 з паловай месяцаў фабрыка трэ' было пашыць 29 160 зімовых паліто, але фабрыка за 11 месяцаў пашыла 236158 паліто, альбо дала 114 проц. выкананьня. А вось з асеньнімі паліто выйшла так:—Трэ' было пашыць 219375 штук, а пашыта—202600 што складае ўсяго толькі 92,4 пр. заданьня.

Зьніжэньне сабекошту выразілася ў 14,3 проц., альбо 12,7 проц. заданьня. Значна зьнізіўся брак, які нават не дасягае 1 працэнта—0,88 проц., у выніку чаго фабрыка мае 8 мільн. рублёў чыстага прыбытку.

На вечары лепшыя ўдарнікі, у ліку 24 чалавек, і адна колектыўная брыгада, у складзе 9 асоб, атрымалі прэміі.

Партколектыў падніс батальёну энтузіястых працоўным сьцяг. У адказ на падарунак энтузіяст—тав. Хэйман сказаў:

— Мы запэўніваем, што будзем трымаць гэты сьцяг горда і высока, каб разам з усімі працоўнымі будаваць і пабудаваць соцыялізм як у нашай краіне, так і ва ўсім сьвеце,—словы тав. Хэймана пакрыліся бурнымі воплескамі і гукамі Інтэрнацыяналу.

Пасьля ўрачыстай часткі адбыўся досыць шырока разгорнуты концэрт, які быў пастаўлен сіламі Беларускай Дзяржаўнай і яўрэйскай капэлаў і іншымі мастацкімі выступленьнямі.

Тодар Алесін.

Лепшыя ўдарнікі прэміяваны

Вагонныя майстэрні малога рамонту адзначаюць дзень ўдарніка перавыкананьнем промфінпляну

Зайшоўшы ў майстэрню, ахапляе нейкая радасьць.—Такарныя і тачыльныя станкі паўдарнаму ганяюць сурамлятныя пасы. Вялізны бандажны станок, пару за парай, адпраўляе вагонныя колы на службу дзяржаве.

На твары рабочых выразна адбіваюцца суровыя будні. Як ніколі людзі захоплены ўдарнай працай. Ты можаш пабыць у майстэрні і высьці з яе, не зьвярнуўшы на сябе нічыёй увагі, бо кожны заняты сваёй працай так шчыра, што ня хоча ад яе і адрывацца.

Дзень ударніка адчуваецца па сапраўднаму, па-сапраўднаму адчуваецца той энтузіязм, шляхам якога рабочыя вагонных майстэрняў дасягнулі значных перавыкананьняў промфінпляну. За апошнія тры кварталы (9 месяцаў) па рамонту пасажырскіх вагонаў промфінплян перавыкананы на 8 проц., па рамонту таварных вагонаў промфінплян перавыкананы на 30,7 проц., па рамонту сібірскіх жорсткіх вагонаў на 14 проц і па рамонту міжнародных спальных вагонаў —на 5 проц. а ў вогуле гэта дае эканоміі—28 755 рублёў.

У дзень ударніка, лепшыя ўдарнікі прэміяваны.

Вось іх прозьвішчы: Ломаць, Скрапіцкі Мазнік Когут, Празіч (жанч.), Годзін, Сабалеўскі, Зіноўеў, Аляшкевіч, Адзінец, Доўнар, Александровіч, Жыгуноў, Гурын, Жывіца, Якунін, Пахомчык, Лютынскі, Вармайчык, Фрыдрых, Авановіч, Бабровіч С., Кадоўна, Савань, Савіч, Навіцкі, і Вержбіцкі.

М. Варонецкі

Вялікі вечар, прысьвечаны дню ўдарніка

300 руб. на дырыжабль „Праўда“

ПЛЕШЧАНІЦЫ, 2. (Па тэлефону ад нашага юнкора). 1-га кастрычніка ў плешчаніцкім нардоме адбыўся вялікі вечар, прысьвечаны дню ўдарніка. На вечары прысутнічала больш 300 чалавек.

Члены професыянальных саюзаў далі на вечары абяцаньне дапамагчы колгасам у скончэньні асеньняй пасяўной кампаніі і сілосаваньні. Працаўнікі міліцыі ўхвалілі да канца пяцігодкі не пакінуць пастоў. Сход ухваліў хадатнова ўнесьці на дырыжабль „Праўда“ 300 руб. Г.

Весткі з-за мяжы

Рабочыя кварталы наводнены паліцыяй

Гвардэйскі полк у баявым снараджэньні, узброены кулямётамі, дэманстратыўна прадэфіліраваў ля савецкага паўпрэдства ў Фінляндыі

Пачаліся выбары ў Фінляндзкі сойм

ГЕЛЬСІНГФОРС, 1. Сёньня пачаліся выбары **у Фінляндзкі сойм.** На гораду разьяжджаюць аўтамабілі коаліцыйнай партыі, дэкарыраваныя ў выглядзе танкаў прадвыбарнымі плякатамі. На некаторых антысавецкія лёзунгі. У цэнтры гораду на часткі дамоў узьняты нацыянальныя сьцягі.

У выбарчых вучастках дзяжураць фашысцкія студэнты.

Рабочыя кварталы наводнены паліцыяй са штыхамі.

На гораду з раніцы маршыруе гвардыйскі полк у баявым снараджэньні ўзброены кулямётамі.

Полк некалькі разоў дэманстрацыйна праходзіў міма савецкага прадстаўніцтва.

„...Далоў белую ўладу!..“

ГЕЛЬСІНГФОРС, 30. У сувязі з набліжэньнем выбараў, рэпрэсіі супроць левых дзеячоў рабочага руху надзвычайна ўмацаваліся. Штодзённа па ўсёй краіне ўтвараюцца масавыя арышты левых дзеячоў рабочага руху. Пачаліся судовыя процэсы рэволюцыйных рабочых. Ня гледзячы на страшэнны тэрор, рэволюцыйныя рабочыя актыўна разгортваюць выбарчую кампанію, выступаючы з выбарчымі сьпісамі (Сьпіс „а“).

Прадвыбарная літаратура левых конфіскуецца ахранкай, сходы разганяюцца паліцыяй.

У Гельсінгфорсе гэтымі днямі ўначы ў розных частках гораду на сьценах дамоў зьявіліся аграмадныя надпісы: „галасуйце за сьпіс рабочых—сьпіс „а“, „далоў белую ўладу“, „галасуйце за комуністых“.

Рабочыя супроць суда над тав. Жарскім

ВАРШАВА, 1. У Лодзі адбыўся суд над польскім комуністычным дэпутатам сойму, т. Жарскім, якому было прад'яўлена абвінавачваньне у тым, што ў часе дэманстрацыі у Лодзі, ён, нібыта страляў у паліцыю. Жарскі быў арыштаваны ня ў час дэманстрацыі, а ў вагоне цягніка, на адной з станцый па дарозе ў Варшаву. Сьведкі, паказаўшыя, што Жарскі, быццам-бы страляў у паліцыю, былі выключна паліцэйскія. Суд прыгаварыў Жарскага да 8 год катаржнай турмы. У Сасноўцах, у Бэндзінгу і Дамброве адбыліся рабочыя дэманстрацыі протэсту супроць суда над Жарскім. Дэманстрацыі былі расьсеяны паліцыяй.

5337 СУДОВЫХ СПРАЎ УЗЬНЯТА СУПРОЦЬ РЭВОЛЮЦЫЙНЫХ РАБОЧЫХ

БЭРЛІН, 25. З 1-га студзеня па 31-га ліпеня 1930 г. супроць рэволюцыйных рабочых Нямеччыны было ўзбуджана 5.337 судовых спраў.

Патрэбна сказаць, што ў сувязі з абвастрэньнем клясавых супярэчнасьцяй Нямеччыны, судовы тэрор супроць рэволюцыйных рабочых яшчэ больш узмацніцца.

У сувязі з гэтым нямецкая секцыя МОПР пачала ва ўсёй Нямеччыне кампанію па вярбоўцы новых членаў па збору сродкаў.

Сярэднявяковая кара адменена толькі на паперы

ЛЕНДАН, 23. Пры зваканым натураньні англійскага „рабочага“ ураду адміністрацыя індыйскіх турмаў працягвае тварыць нячуваныя бясчынствы над зьняволенымі рэволюцыянэрамі. Без перабольшваньня можна сказаць, што „парадкі“ у індыйскіх турмах нагадваюць мрачныя часы сярэднявякоўя. Паказальны у гэтых адносінах тыя крывавыя бясчынствы, якія адбываліся у турме ў Міруне 29-га ліпеня 1930 г., і аб якіх зараз паведамляюцца новыя падрабязнасьці.

У мірунскай турме, у якасьці палітзьняволеных трымаецца шэраг „небясьпечных“ рэволюцыянэраў... ва ўзросьце ад 9 да 11 год. Яны та і зьявіліся ахвярамі дзікага разгулу турэмных наглядальнікаў.

29-га ліпеня на малалетніх „злачынцаў“ накінуліся турэмныя вартаўнікі і жорстка зьбілі іх. Крыкі зьбіваемых дзяцей пранікалі ў камеры іншых палітзьняволеных і выклікалі з іх боку бурны протэст.

Аб гэтым даведзі да ведама начальніка турмы. Ён распарадзіўся падпарадкаваць „злачынцаў“ дысцыплінарнаму спагнаньню. Гэта распараджэньне выклікала новую буру протэсту. Усе палітзьняволеныя абвясьцілі аб сваёй солідарнасьці з „злачынцамі“. Рух протэсту супроць расправы прыняў такія ўгушальныя размеры, што адміністрацыя турмы выклікала паліцэйскіх, якія са штыхамі і бамбуковымі палкамі накінуліся на зьняволеных. Два палітзьняволеных —Мірайнар і Гасваат — атрымалі цяжкія раненьні. 30-га ліпеня адміністрацыя турмы распарадзілася наладзіць сьцёбаньне палітзьняволеных. 13 палітзьняволеных атрымалі па 30 удараў бізуном кожны. Удары наносіліся спэцыяльным бізуном „дзевяцьхвостай“, так званай „кошкай“. Зьбітыя палітзьняволеныя напалову страцілі прытомнасьць. Адміністрацыя турмы пакінула сьцякаючых крывёю палітзьняволеных ляжаць пад сьпякай сонца. 57 іншых палітзьняволеных былі закаваны ў жалезныя калодкі.

Гэта сярэднявяковая кара, якая на паперы адменена ўжо некалькі год таму назад, на справе ня выкінута з практыкі індыйскіх турэмшчыкаў.

Крывавая расправа ня толькі не напужала палітзьняволеных, а наадварот,—дала новы штуршок іх руху протэсту. У адказ адміністрацыя турмы пастанавіла пазбавіць палітзьняволеных права прагулак, курэньня, атрыманьня літаратуры і інш. Акрамя таго, адміністрацыя пастанавіла падпарадкаваць палітзьняволеных новаму, удасканаленаму катаваньню: яна забараніла дастаўляць ім лёд, які ў жаркі час году ў перапоўненых турмах — адзіны ратунак.

Асеньняя сяўба—рашаючае зьвяно колгасна-вытворчага паходу комсамолу

КОМСАМОЛ, НА ЗАМАЦАВАНЬНЕ ПРЫЛІВУ!

Дзякуючы шырока разгорнутай масавай працы сярод бядняцка-серадняцкіх мас адзіналічнікаў у Бягомльскім раёне і некаторых сельсаветах Чэрвеншчыны організавана 10 новых колгасаў і маецца вялікі прылiў у старыя колгасы

Камітэтам і ячэйкам—накіраваць свае сілы на замацаваньне новага прыліву ў колгасы, шырокай масавай працай організоўваць беднату і серадняцтва для пасьпяховага правядзеньня чарговых гаспадарча-палітычных мерапрыемстваў і ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай колектывізацыі

Сорак учарайшых адзіналічнікаў—сёньня колгасьнікі

У Чэрвенскім раёне за апошнія дні наглядаецца вялікі рух бядняцка-серадняцкіх колаў сялянства за колектывізацыю. Ухваляючы пастановы партыйных зьездаў, бядняцка-серадняцкія масы організуюць новыя колгасы і далучаюцца да старых.

Па Хутарскім сельсавеце, у час праграцоўкі адозвы ЦК УсеКП(б) і правядзеньня хлебазагатоўчай кампаніі, організаваны два колгасы: колгас Ленінскі шлях, у які ўвайшлі ўсе 25 гаспадароў вёскі, і колгас у вёсцы Малая Ганута, з 15 гаспадарак.

У Калодыскім сельсавеце, у вёсцы Слабодка, організаваны колгас „Ударнік“, а ў вёсцы Бярозаўка—ініцыятыўная група, якая зараз праводзіць вярбоўку ў колгасы.

Усяго за апошні час па Чэрвенскім раёне організавана пяць новых колгасаў.

Але побач і з актывізацыяй бядняцка-серадняцкіх мас у барацьбе за колгасы, актывізаваўся і клясавы вораг. Маюцца асобныя прыклады, калі клясава-варожыя элемэнты, праводзячы сваю контр-рэволюцыйную працу ў вёсцы Матусова-Галава, Хутарскога сельсавету, вывесілі на доме старшыні колгасу адозву, якая заклікала сялян ня iсьці ў колгас.

Гэтыя факты вылазкі клясава-варожых элемэнтаў патрабуюць ад партыйна-комсамольскіх ячэек, ад партыйцаў і комсамольцаў большай дбайнасьці да клясавага ворага.

С. Ціхі.

Адзінаасобнікі дапамагаюць колгасам

Скончылі сяўбу на 5 дзён раней тэрміну

Па вёсках Дудзіцкага сельсавету, Самахвалаўскага раёну, партыйныя і комсамольскія ячэйкі разгарнулі вялікую працу сярод адзінаасобнікаў. У выніку—колгасу імя „Комвузу Беларусі“ прышлі на дапамогу **15 адзінаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, якія дапамаглі абсеяцца.**

Грэбеньская пажарная дружына організавала ўдарную брыгаду па дапамозе колгасу „Расьсьвет“. Сяўба ў вышэй пералічаных колгасах закончылася 25-га верасьня, г. зн. **на 5 дзён раней тэрміну.** У колгасах сельсавету пачаўся прыліў колгасьнікаў.

Чаборык.

Пяць новых колгасаў

Па Бягомльскім раёне шырока разгарнулася праца па правядзеньню асеньняй пасеўнай кампаніі. РК КП(б)Б вылучаны брыгады з раённага актыву, якія ў вёсках праводзяць працу па сяўбе і растлумачэньню сялянству рашэньняў XVI партзьезду і адозвы ЦК УсеКП(б).

У выніку праведзенай шырокай масавай працы, на сёньняшні дзень мы маем ужо організаваных 5 новых колгасаў: у вёсцы Усьпрон[illegible] організаваны колгас з 18 гаспадарак, у вёсцы Клінікі— з 16, у вёсцы Рожна—з 26 гаспадарак і ў вёсцы Бабцах—з 11 гаспадарак. Побач з гэтым, брыгады організавалі па шэрагу вёсак ініцыятыўныя групы з сялян, па 4-5 чалавек, якія праводзяць падрыхтоўчую працу да організацыі колгасаў.

Нова організаваныя колгасы ўжо распачалі колектыўны пасеў азімага кліну.

Г. Ч.

Пачалася малацьба

Малацьба збожжа ў колгасе „Ленінскі шлях“

Чатыры брыгады Жыліцкай ячэйкі ЛКСМБ—на палёх колгасаў

Для пасьпяховага выкананьня задач, якія стаяць перад колгаснавытворчым паходам комсамолу і асеньняй пасеўкампаніяй, Жыліцкая ячэйка (Бабруйскага раёну) організавала 4 брыгады з комсамольцаў і беспартыйнай моладзі, якія практычна дапамагаюць колгасам і саўгасам у выкананьні задач асеньняй пасеўнай кампаніі.

Брыгады абвясьцілі сябе ўдарнікамі і заключылі між сабою ўмовы соцспаборніцтва. Брыгады 10 дзён працуюць у колгасах, дапамагаючы ім у асеньняй пасеўнай і уборачнай кампаніях.

Брыгада ў саўгасе Жылічы дапамагла засеяць 66 гектараў жыта, замест вызначаных плянам 46. Вучні Жыліцкай сямігодкі дапамаглі колгасу зьняць 4000 пудоў яблык і абмалаціць каля 500 цэнтнэраў жыта на насеньне для акалічных колгасаў.

Комсамольскія брыгады па колгасах выкапалі 4 сілосныя ямы і прыступілі да запаўненьня іх сілосам. У Паркімхавіцкім колгасе брыгада сваімі сіламі будуе сьвінарнік.

Ударныя тэмпы працы брыгады ўзьнімаюць хвалю бадзёрасьці і ўдарніцтва сярод рабочых саўгасаў і колгасьнікаў.

Еф. Залескі.

У баку ад колгаснага жыцьця

У Плешчаніцкім раёне маюцца такія колгасы, якія па сёньняшні дзень ня ўсеяліся. Так, напрыклад, колгас „Чырвоная Беларусь“ (Крайскі сельсавет) пасеўны плян выканаў толькі на 20 проц.

Да сяўбы колгас ня быў падрыхтаваны. Адчуваецца вялікі недахоп у баронах і плугох. Комсамольская ячэйка стаіць у баку ад колгаснага жыцьця. Сакратар ячэйкі т. Басіла кажа, што ён заняты іншай працай, а што рываецца сяўба" дык гэта яго не датычыцца.

Гурвіч.

Па-ўдарнаму скончылі асеньнюю сяўбу

Колгас імя 16 партызан, Сьмілавіцкага раёну, па-бальшавіцку скончыў асеньнюю пасеўную кампанію. Плян асеньняй сяўбы выкананы на 100 проц., а па некаторых культурах перавыкананы. Згодна пляну колгас павінен быў засеяць 50 га жыта і 4 га пшаніцы, засеяна-ж азімай пшаніцаю 10 га. Сяўбу колгас скончыў 24 верасьня.

Праца праводзілася метадам ударніцтва і соцспаборніцтва. Організаваныя ўдарныя брыгады апраўдалі сваю назву. За час працы на правядзеньню асеньняй сяўбы ня было ніводнага спазьненьня і самаўласнага невыхаду на працу.

Вялікую дапамогу колгасу ў правядзеньні асеньняй сяўбы аказаў саўгас Дукоры, які дапамагаў роўнымі машынамі і адпусьціў для абсеменьваньня колгасу гатунковага жыта.

Скончыўшы асеньнюю сяўбу, колгас па-ўдарнаму распачаў уборку бульбы. За адзін дзень 25 верасьня колгас выканаў 7 га бульбы. У гэтай працы яму актыўна дапамагае дукорская 7-гадовая школа, вучні якое абвясьцілі сябе мобілізаванымі на 10 дзён на ўборцы бульбы.

Актыўная дапамога з боку саўгасу і працоўнай грамадзкасьці ўзьняла сярод колгасьнікаў яшчэ большы энтузіязм у працы. Колгасьнікі запэўніваюць, што пры такой дапамозе колгас заўсёды з пастаўленымі перад імі партыяй задачамі справіцца.

Цімох Лявіцкі.

Чырвоныя абозы ў Плешчаніцах

Плешчаніцы, 2 (Па тэлефону ад нашага юнкора). У адзнаку дня ўдарніка, па Плешчаніцкім раёне былі організаваны суцэльныя чырвоныя абозы з хлебам і бульбай.

У мястэчку Плешчаніцы адзінаасобнікі Акалоўскага сельсавету адалі каля 11 тысяч пудоў бульбы і запэўнілі на мітынгу, што выкананюць і перавыканаюць заданьні па загатоўках.

ПЛЕШЧАНІЦЫ, 2-Х (Па тэлефону). Сёньня ў м. Плешчаніцы прыбыў чырвоны абоз бульбы ў лі у 50 падвод. Прывезена 2000 пудоў бульбы.

Коопэрацыя адмаўлялася прымаць бульбу. Толькі па настайваньню пракурора бульба была прынята.

Гельфман.

САВЕЦКІЯ І КАПІТАЛІСТЫЧНЫЯ ЎМОВЫ Ў РАЗЬВІЦЬЦІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

XV зьезд партыі „у якасьці асноўнай задачы ў вёсцы“ паставіў задачу „аб'яднаньня і пераўтварэньня дробных індывідуальных гаспадарак у буйныя колектывы“.

Гэтым рашэньнем увесь характар разьвіцьця нашай сельскай гаспадаркі карэнным чынам быў зьменены і накіраваны ў бок яго соцыялістычнай рэконструкцыі „на аснове грамадзкай, таварыскай, колектыўнай апрацоўкі зямлі, з прымяненьнем с.-г. машын і трактароў з прымяненьнем навуковых спосабаў інтэнсыфікацыі земляробства“ (Сталін).

Простай утопіяй і фантазёрствам зьяўляюцца гутаркі аб тым, што ўжываньне с.-г. машын і трактароў,—без чаго нельга мысьліць сапраўднага ўздыму вытворчасьці с.г. працы,—магчыма ў рамках дробнай і індывідуальнай гаспадаркі. Лепшым паказам такой „магчымасьці“ можа зьявіцца амэрыканская сельская гаспадарка, дзе колькасьць трактароў, якія працуюць на палёх, дайшла да мільёну штук, і ў той жа час 4 пятых фэрмэраў ня маюць магчымасьці набыць трактароў.

Трактар недаступны пераважнай большасьці амэрыканскіх фэрмэраў, а гэта значыць, што вытворчая перавага ў вядзеньні сельскай гаспадаркі пры дапамозе машын аказваецца на баку невялікай часткі багатых фэрмэраў—уласьнікаў трактароў і іншых удасканаленых с.-г. машын.

Натуральным вынікам такога становішча зьяўляецца рост прыбыткаў у маючых посьпех пры дапамозе машын багатых фэрмэраў і хуткае збяденьне астатняй іх масы. Усё гэта адбываецца ня толькі ў Амэрыцы, але і ва ўсіх капіталістычных краінах. Машыны ўсюды пракладаюць сабе дарогу на палі, бо стары спосаб апрацоўкі зямлі ўжо няпрыгодны з пункту погляду народна-гаспадарчых інтарэсаў і стану вытворчых сіл, але характар гэтага прасоўваньня рэзка розьніцца ў нас і ў капіталістых.

Увядзеньне машын у нас адбываецца разам з аб'яднаньнем буйнай гаспадаркі шляхам аб'яднаньня працоўных мас вёскі ў вытворчыя колектывы. Колектыўны парадак карыстаньня машынай сваім бліжэйшым вынікам мае павышэньне матар'яльнага і культурнага ўзроўню сельскіх працоўных мас. У цэлым шэрагу колгасаў валавы прыбытак на члена ўжо ў гэтым годзе значна вышэй, чым ён быў у індывідуальнай гаспадарцы, прычым у наасобных колгасах прыбытак амаль што падвоіўся.

Адначасова ў колгасах шырока разгортваецца работа па бытавому (ясьлі дзіцячыя, пляцоўкі і г. д.), па культурна-асьветнаму (хаты-чытальні, клюбы, школы і г. д.) абслугоўваньню колгасных мас. У некаторых месцох адчыняюцца сярэднія навучальныя ўстановы.

Тлумачыцца гэта ўсё тым, што справа соцыялістычнай перабудовы вёскі ва ўмовах дыктатуры пролетарыяту ёсьць справа самых працоўных мас вёскі, выходзіць з іх інтарэсаў і накіравана супроць эксплёататарскай прагнасьці кулацтва.

Другая справа ў капіталістых, дзе пануе прыватная ўласнасьць на зямлю і на ўсе сродкі вытворчасьці. Рост буйнай вытворчасьці там і карыстаньне машыннай тэхнікай не толькі не павышае матар'яльны і культурны ўзровень сельскіх працоўных мас, але з'убожвае іх, ператвараючы ў пролетараў, якія эксплёатуюцца ўзбагачанымі іхняй працаю эксплёататарамі, што забралі ў свае рукі на аснове прыватнай уласнасьці ўсю зямлю і ўсе сродкі вытворчасьці.

Але ня толькі ў гэтым іншая перавага. Прыватная ўласнасьць вельмі часта становіцца перашкодай дзела рацыянальнага скарыстаньня новай тэхнікі ў сельскай гаспадарцы. Амэрыканскі трактар працуе значна менш чым трактары ў колгасах і саўгасах, бо прыватная ўласнасьць на зямлю перашкаджае поўнаму скарыстаньню машын.

Паразытычны характар капіталістычнай гаспадаркі тармозіць разьвіцьцё вытворчых сіл, не дае рабочым стымулаў да ўзьняцьця на больш высокую ступень вытворчасьці [illegible] тады як адсутнасьць прыватнай [illegible] насьці ў нас, пры плянавым [illegible] гаспадаркі і простая сувязь між [illegible] стам і вытворчасьцю працы і па[illegible] шэньнем матэр'яльнага дабра[illegible] працоўных—стварае ўсе неабходныя ўмовы для максымальнага выкарыстаньня тэхнічных і вытворчых [illegible] чымасьцяў, якія толькі ў нас ма[illegible]

Вытворчая спэцыялізацыя с.-г. [illegible] [illegible] якую мы ажыцьцяўляем на [illegible] вах грамадзкай плянавай гаспадаркі, утварае максымальна спрыяючыя [illegible] вы для найшырэйшага вытворчага [illegible] карыстаньня прыродна-гістарычных [illegible] кліматычных умоў, якія ў нас ма[illegible] У капіталістычных умовах, дзе [illegible] ская гаспадарка падпарадкавана [illegible] нам рынку, дзе адзіным сты[illegible] зьяўляецца высокая норма прыбы[illegible] ні пра якое сапраўднае рацыяна[illegible] разьмяшчэньне с.-г. вытворчасці гутаркі быць не можа. „Норма прыбытку,—пісаў Маркс,—гэта сіла, прыводзіць у рух капіталістычную вытворчасьць; вырабляецца столькі і настолькі, наколькі можна [illegible] рабіць з прыбыткам“. Дырыжэр[illegible] рынкам, а не патрэбы, пачатак [illegible] жыць у аснове капіталістычнай [illegible] творчасьці, а гэта вядзе да кр[illegible] да перавытворчасьці, да зруйнаваньня вялікай масы вытворцаў, да [illegible] чэньня хаўрус спэкулянтаў.

Капіталістычныя ўмовы і панава[illegible] не прыватнай уласнасьці на [illegible] непазьбежна вядуць такім чынам толькі да зруйнаваньня мільёнаў дробных і драбнейшых уласнікаў, якія непазьбежна паглынаюцца буйнымі капіталістычнымі акуламі, але і [illegible] [illegible] разьвіцьцё вытворчых [illegible] абмяжоўваюць найлепшыя ма[illegible] масьці выкарыстаньня ў сельскай гаспадарцы новай тэхнікі і дасягненьняў с.-г. навукі. Толькі соцыялістычны спосаб вядзеньня сельскай гаспадаркі зьнішчае ўсе перашкоды, якія стаяць на шляху поўнага разгортваньня вытворчых сіл і творчай ініцыятывы шырокіх працоўных мас. **А. Карае[illegible]**

ДАБІЦЬ БЕЗГАСПАДАРНАСЬЦЬ І БЮРОКРАТЫЧНАЕ ІГНАРАВАНЬНЕ ІНІЦЫЯТЫВЫ І ПРАПАНОЎ РАБОЧЫХ

Яны зьяўляюцца перашкодай поўнаму звароту шклянога доўгу краіне

„Галоўным і рашаючым недахопам у гаспадарчай рабоце застаецца няўменьне арганізаваць і стаяць на чале ўзрастаючай актыўнасьці рабочай клясы" (З адозвы ЦК УсеКП(б)

Час з кастрычніка да 1 студзеня зрабіць ударным кварталам барацьбы за зьняцьце заводу з чорнай дошкі

Безгаспадарнасьць,—з нумарамі і без нумароў

(Ад нашага спэцыяльнага карэспондэнта)

— Выкананьнем прамфінпляну на асобных варштатах,
— сацыялістычнай кантрактацыяй 278 чалавек,
— 95 ударнікаў імя 3 году пяцігодкі,
— арганізацый груп энтузіястых,
— падпіскай на пазыку „пяцігодка ў чатыры гады",
— уцягненьнем у партыю ўдарнікаў, у комсамол маладых рабочых,— адказалі рабочыя заводу „Кастрычнік" на адозву ЦК УсеКП(б).

Прайдзецеся ў час работы па заводзе, і вы пачуеце:

абураючыя гутаркі аб прагульшчыках, лятунох—абурэньне з прычыны безгаспадарнасьці на заводзе і сапраўды:

Безгаспадарнасьць № 1

У шліфэрным цэху 25-IX затопачныя машыны прастаялі 15 хвілін. Прычыны вельмі сур'ёзныя! Не было шрычак! Не зьдзіўляйцеся,—дзесятнік Казлоўскі не падрыхтаваў сярнічак,— у выніку 6 затопачных машын прастаялі па 15 хвілін.

Безгаспадарнасьць № 2

У тым-жа цэху, напярэдадні выхаднога дня, рабочыя, замест 6-ці гадзін, працавалі 8. На заводзе—„проба", і для ліквідацыі яе рабочыя ідуць на ўсё. Рабочыя заяўлялі аб няспраўнасьці матору, але яго не справілі. Паперагаралі пробкі, маторы і машыны іншоў стаялі па 15 хвілін.

Безгаспадарнасьць № 3

На двары стаяць скрыні з гатовым фабрыкатам. На страху аднаго з будынкаў трэ' было ўзьнесьці пясок: паклалі дошкі на скрыні, паламалі 3 скрыні гатовага шкла. Экспэдытар Масловскі аб гэтым не ведае.

Безгаспадарнасьць № 4

У лесацаху у гатэрнага варштата аслаб фундамант. Рабочыя неаднаразова заяўлялі аб гэтым мэханіку Ступакову і сьлесару Красько. Яны ў сваю чаргу пісалі рапарт дырэктару заводу,—той адказаў: „Трэба працаваць больш асьцярожна". Пасьля такога адказу да варштата пастаялі некваліфікаваных рабочых. Нагрузілі варштат да 14 піл, тады як ён можа працаваць на 8 пілах. Варштат з дня ў дзень працаваў усё горш і горш, нарэшце, 21 верасьня дасягнуў свайго „апогея",—лопнуў.

Два разы гарэлі падшыпнікі, іх залівалі зверх вадой, палівалі зелёнафтай, і... загадвалі працягваць работу. У выніку—варштат разьбіўся ўшчэнт.

Сьледчыя органы ўзяліся цяпер за гэтую справу. Але дагэтуль не падлічаны страты з-за галаваняцкіх адносін да „Гатэра" тэхніка Скрупнокова і сьлесара Красько.

Пералічаньне безгаспадарнасьці можна працягваць бяскоца. Адміністрацыйна-тэхнічны пэрсонал абвясьціў сябе мобілізаваным але калі ён зразумее ісьціну, што: „Зьнішчаньне безгаспадарнасьці, памножанае на энэргію і энтузіязм рабочых заводу, у выніку дасьць выкананьне прамфінпляну"—гэта пытаньне чакае адказу.

Вось прагульшчыкі заводу...

Іх многа! За верасень месяц 13 чалавек па выдувальным цэху, 6 чалавек па шліфэрным, 2—па матэр'яльным. Разам 21 чалавек прагулялі ў адказ на адозву ЦК.

Прагульшчыкі таксама розныя бываюць: Пятроў Васіль, Брылеўскі Ігнат—гэта злосныя прагульшчыкі. Але, вось комсамолка-лепшая ўдарніца Фінкельштэйн—праспала падвёў таварыш, не разбудзіў і яна зараз залічана ў прагульшчыцы. Аднак з яшчэ большым захапленьнем і энэргіяй працуе яна на вытворчасьці, і толькі чырванее, калі напомняць ёй аб прагулах.

З імі барацьба розгакадыровая вядзецца. Асабліва стараецца клюб.

— Дзесятнік;—Пішы...

Так складаўся вучот ударнікаў. Ім пасылаліся запрашальныя білеты на вечар... Па сьпіску—ударнікаў лічыцца 240, а калі падлічалі, праверылі, дык аказалася, што ударнікаў імя 3-га году пяцігодкі ўсяго 95 чал.

Да Усесаюзнага дня ўдарніка рашылі прэміяваць лепшых ўдарнікаў. Старшыня завкому, т. Кузьмін мітусіцца на працягу тыдню па заводзе і ніяк не можа выявіць лепшых.



Нос, які затуліў усё...

Загадчык клюбу тав. Ганчароў майстра на ўсе рукі: музыка, мастак жывапісец, паэта...

Ён напісаў песьню:

„Вось прагульшчыкі заводу:
Ванька Штаў,
Тут-Пятроў і сам Шалкоўскі—
Розных відаў.
Шмаковіч, Пімен разам—
На падмогу
У гэты сьпіс прышлося ўвесьці
і Юрцову і г. д.

Гэтая песьня, на матыў: „як радная мяне маць праваджала", сьпяваецца ў клюбе перад пачаткам кіно ўсімі прысутнымі.

Настрой прагульшчыкаў зразумелы.

Аб „лятунох" клюб таксама не забывае. Дя зьлёту ўдарнікаў тав. Ганчароў напісаў інсцэніроўку, у якой едка высьмейвае „лятуноў": Казлоўскага Янку, Палаўчыню Сямёна, Штольбэрта Фрыдрыха. Гальваса Адама Бабкова Сямёна, Казлоўскага Рыгора. Яны лёталі у Ленінград, Магілеў і звярнуліся ізноў на завод.

А завком?

Завком не вядзе вучоту прагульшчыкаў. Завком да гэтага часу не здолеў наладзіць вучоту ўдарнікаў імя 3 году пяцігодкі. А калі склікаўся зьлёт ударнікаў, дык сакратар завкому—тав. Максімюк, запыхаўшыся бегаў ад дзесятніка да дзесятніка—шукаў ударнікаў.

Пам ж імі адбыўся наступны дыялёг:

Максімюк:—Колькі ў цябе ўдарнікаў?

Дзесятнік:—Уся зьмена даўно абвясьціла сябе ударнай, але не ўсе па ўдарнаму працуюць.

Максімюк:—Ня важна. Давай тых, хто лепш працуе!

Па волі хваль

На заводзе ёсьць хворае месца—падсобная сіла. Ад падсобнікаў шмат у чым залежыць выкананьне прамфінпляну.

Падсобная сіла ў сваёй большасьці комплектуецца з сялянскай моладзі акалічных вёсак. Яны прыносяць з сабой цэлы шэраг сялянскіх настрояў. Адпрацаваўшы 8 гадзін—уцякаюць дамоў—Кажуць рабочыя:—Гэтых на сход не зацягнеш. Яны не хварэюць за вытворчасьць. Сёньня працуюць, заўтра—не. Глядзячы па настрою.

Здавалася-б, што для комсамолу тут непачаты край работы.

А на сходах рабочых стары рабочы Майхровіч кажа:

— Комсамол сярод падсобнай сілы работы не вядзе.

І ён не памыляецца.—Сакратар комсамольскага колектыву, т. Фурман, напэт не ўяўляе сабе як гэта правесьці сход падсобнікаў. На працягу цэлага году не толькі сходы не праводзіліся, але ніхто з комсамольскіх кіраўнікоў з падсобнікамі не пагутарыў.

У адказ на адозву ЦК комсамол абяцаў арганізаваць групы энтузіястых і ўдарныя варштаты.

Комсамольцы абвясьцілі сябе энтузіястымі, але бюро колектыву да гэтага часу не знайшлі часу склікаць іх, расказаць аб іх задачах, аб патрабаваньнях, якія прад'яўляюцца энтузіястым.

Абяцанкі аб організацыі ўдарных комсамольскіх варштатаў засталіся на паперы.

Комсамольцы ў цэхах цягнуцца за партыйнай організацыяй за рабочымі. Іх захапляе энтузіязм мас, а бюро колектыву гэтым рухам не кіруе, і ўсе плыве па волі хваль.

Э. Каганская.

Зводка выкананьня прамфінпляну па гуце „КАСТРЫЧНІК"

З 11 па 18 верасьня

Шкло круглага гараньня:—па пляну	63.350	штук,
выдута	55.849	„
Шкло пласкага гараньня:—па пляну	457.400	„
выдута	476.341	„
Малочныя слоікі:—па пляну	19.640	„
выпрацавана	20.6?5	„
Устаўкі:—па пляну	11.500	„
выпрацавана	5.868	„
Фусляпы:—па пляну	49.680	„
выпрацавана	49.173	„

З 18 па 25 верасьня

Шкло круглага гараньня: па пляну	69.800	„
выдута	60.201	„
Шкло пласкага гараньня: па пляну	457.600	„
выдута	436.987	„
Малочныя слоікі:—па пляну	21.090	„
выпрацавана	25.052	„
Устаўкі: па пляну	9.750	„
выпрацавана	6.764	„
Фусляпы:—па пляну	48.640	„
выпрацавана	48.212	„

Пост „Чырвонай Зьмены"

Да адказнасьці за зрыў кватэрнага будаўніцтва

ЖАКТ'у „Чырвоны Хэмік" па шклозаводзе „Кастрычнік" было адпушчана на 1930 год на будаўніцтва 91.000 рублёў. Закупілі матэр'ялы, заложылі фундамент для 4-х дамоў і перавезьлі для рамонту 2 старыя будынкі, адным словам змаглі-б забясьпечыць кватэрамі 40 рабочых семей.

Раптам атрымоўваем пісульку: з 91.000 урэзваюць 16.000, а 25.000 невядома дзе згінулі. Іх павінен быў даць Акржылсаюз, але ён ліквідаваны, а з ім ліквідаваны і грошы.

Пачатае будаўніцтва прышлося спыніць.

Зараз два непакрытыя будынкі гніюць пад дажджом, а рабочым няма дзе жыць. Гэта адбіваецца на выкананьні прамфінпляну. Хто-ж у гэтым вінаваты?

Няхай сваё слова скажа РСІ.

Старшыня Жакту **Какок.**

Адміністрацыя не рэагуе на прапановы рабочых

Дзякуючы несваечасоваму рамонту затопачных машын, кожны дзень маюцца прастоі 22-га верасьня ў аднэй зьмене было 50 хвілін прастою.

Пераборка пасуды дрэнная. Калі работніцы зьвяртаюцца да адміністрацыі з заявай аб дрэннай пераборцы, дзесятнік Макараў адказвае:—„Не пайду я з пераборшчыкамі біцца". Мы не прымушаем дзесятніка біцца, але патрабуем уважліва адносіцца да нашых прапаноў і стварыць адпаведныя ўмовы рабочым для выкананьня прамфінпляну.

Гэтым „об'ектыўным прычынам" невыкананьня прамфінпляну па шліфэрным цэху павінен быць пакладзен канец

Пост „Чырвонай Зьмены"—
ФІНКЕЛЬШТЭЙН.

Рэалізуем адозву ЦК УсеКП(б)

Складзем сустрэчны баявой падрыхтоўкі

Адозва ЦК знайшла шчыры водгук у асяродзьдзі чырвонаармейцаў Самарскага кавпалка. На апошніх практычных занятках адозва прапрацоўвалася чырвонаармейцамі. У 3-ім эскадроне, па ініцыятыве чырвонаармейца Мартынюка, адзін узвод абвясьціў сябе цалкам ударным імя 3-га году пяцігодкі. Вядзецца работа, каб усіх чырвонаармейцаў няўдарнікаў уцягнуць ва ўдарнікі імя 3-га году пяцігодкі.

Па ініцыятыве Мартынюка наладжан нядзельнік у выхадны дзень. Працавалі ў саўгасе „Будзённага". Выручка ад нядзельніка пойдзе ў фонд індустрыялізацыі.

Партыйная організацыя, палка прапрацаваўшы адозву, аб'явіла сябе мобілізаванай на ліквідацыю ўсіх недахопаў у баявой падрыхтоўцы, на організацыю сустрэчнага пляну баявой падрыхтоўкі, на організацыю збору чырвонаармейскіх прапаноў, на ўзмацненьне работы ў падрыхтоўцы колгасных кадраў.

Г. Шыфрын.

Будзем працаваць у міліцыі да канца пяцігодкі

Мы, комсамольцы і беспартыйныя працаўнікі ІІ-га аддзяленьня Менскай Гарміліцыі, абгаварыўшы адозву ЦК, пастанавілі:

Ва што-б там ні было ліквідаваць прарыў у нашай рабоце: сьпячку на пасту, нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў, вызыць цякучасьць і г. д.

Усе мы, у складзе 76 асоб, абвяшчаем сябе ўдарнікамі імя 3-га году пяцігодкі і даем абяцаньне служыць у шэрагах міліцыі да сканчэньня пяцігодкі.

Выклікаем паследваць нашаму прыкладу ўсіх астатніх работнікаў міліцыі другога аддзяленьня і работнікаў іншых аддзяленьняў гарадзкой міліцыі.

**Па даручэньню сходу
Бюро ячэйкі ЛКСМБ**



1. Лятуноў выключаць з прафсаюзу. 2. Выганяць з комсамолу і партыі. 3. Аб'явіць байкот.

Сьвірыдовіч у руля

28-га верасьня адбыўся сход комсамольскага колектыву Менскай аб'яднанай профтэхшколы, сумесна з вучнямі і інструктарамі школы, па пытаньню самакрытыкі і адмінначальля.

Прадстаўнік Кастрычніцкаўскага РК ЛКСМБ застанавіўся на момантах, якія сталі перад школай у галіне падрыхтоўкі кадраў і адмінначальля.

— Не дамо скарыстаць самакрытыку ў сваіх мэтах варожым, шкодным і разлагаючым элемантам, якія за сваю шкодную разлагаючую дзейнасьць выключаны са школы,— заявіў сход.

На сходзе адзначана, што школа да новага навучальнага году была непадрыхтаванай. Інтэрнаты не падрыхтаваны. Замест 120 чалавек, у інтэрнатах зьмешчана толькі каля 50 чалавек. Настаўніцкі склад не табраны, як належыць. Самакрытыка ў школе зацісьнута, належным чынам з боку загадчыка школы тав. Сьвірыдовіча. Вучні першага і другога курсаў баяцца выступаць на сходах з крытыкай недахопаў.

Адмінначальле ў школе дыскрэдытуецца.

—Я вас сёньня-ж выключу са школы!—заяўляе загадчык вучням-палівічкам, выганяючы іх з канцэлярыі.

Сьвірыдовічу чамусьці не падабаецца працаваць у контакце з комсамольскім колектывам.

— Я перад бюро комсамольскага колектыву не раблю справаздачы!— заяўляе ён сакратару колектыву.

Па-бюрократычнаму зьдзекваецца Сьвірыдовіч над старшынёю вучкому— тав. Малюковічам.

З грамадзкімі і вучнёўскімі організацыямі ён не хоча гаварыць.

— Я з вамі не лічуся!—гаворыць ён т. Малюковічу.

У прыёмовую камісію школы Сьвірыдовіч не ўпусьціў т. Малюковіча на пасяджэньне.

—І без цябе абыйдземся!

Пры ўнясеньні прапановы Малюковічам, Сьвірыдовіч адказаў:

— Будзем лезьці, — дам па руках—адсохнуць, бо за сябе не ручаюся.

Шматлікія выпадкі кіданьня розных рэплік па адрасу вучняў, як напрыклад: „Махновец“. „Фашыст“, „Бандыт“ і г. д. штодзённа паўтараюцца за т. Сьвірыдовічам.

На вытворчай нарадзе Сьвірыдовіч заявіў комсамолу:

— Я з вашымі дырэктывамі і прапановамі не лічуся!

Насьценгазэта не працуе. Калі і выйдзе, дык не адчуваецца ў газэце жыцьця школы. РК ЛКСМБ да гэтага часу не зацікавіўся праверкай пытаньня аб палепшаньні матар'яльнага становішча вучняў. А яно вельмі дрэннае... Атрымліваюць вучні па 10-15 рублёў, на гэтыя грошы яны павінны харчавацца ў сталоўцы і абувацца.

Выпуск трэцяга курсу—пад пагрозай зрыву. У апошні час на трэцім курсе ўвялі новую дысцыпліну —нямецкую мову, тады як іншыя дысцыпліны скарачаюцца.

Лекцыі чарцяжна на другім курсе ўжо не было некалькі раз.

Комсамольскі колектыў гэтым пытаньнем мала займаецца.

Трэба зараз-жа на ўсё гэта зьвярнуць неабходную ўвагу.

Мы патрабуем ад Кастрычніцкаўскага райкому комсамолу праверыць становішча самакрытыкі ў Менскай профтэхшколе.

Яўхім Днапроўскі.

Ад рэдакцыі: Зьмяшчаючы газэту-заметку, рэдакцыя „Ч. З.“ прапануе Кастрычніцкаўскаму РК КСМ неадкладна праверыць і ўжыць неабходныя захады да аздараўленьня становішча ў Профтэхшколе. Аб выніках паведаміць рэдакцыю „Ч. З.“ праз тыдзень.

Школа політэхнізуецца

Вучні школы імя Карла Маркса (Масква) на практычных занятках

Паштовая скрынка

Юнкорам: А. Марову, Плотчанку, Ударнік у. Вашы дописы аб падрыхтоўцы да дню ўдарніка не пойдуць. Вы ў сваіх дописах не прыводзіце ні аднаго конкрэтнага факту падрыхтоўкі. Напішэце аб тым, як пройдзе ў вас дзень ударніка.

Кражу—Допіс пад назвай „Дела электрическое“ не пойдзе. Зьмясьціце яго ў заводзкай газэце.

Рабкору А. А.—Допіс „Аддзераць бюрократаў“ будзе выкарыстаны карыкатурай у наступным нумары бюлетэню.

А. І.—Заметка „Не здамо позыцый“ не пойдзе. У ёй, як і ў заметцы групы рабкораў, адсутнічае конкрэтнасьць. Вы пішаце пра ўхілы, выкліканы адозвай ЦК, але не ілюструеце гэтае сьцьвярджэньне фактамі.

Панехіну—„Аб сельска гаспадарчай арцелі „Чырвоная Зорка“, Юнкору Міхасю—„Уборка ўраджаю на Тураўскім р-не“, М. Ракіце—„Няма сувязі“, Гуавану—„Аб павароце комсамольскіх ячэек тварам да вытворчасьці“, Гурэвічу—„Аб уборцы жыта ў колгасе „Чырвоная Зорка“, Кулікову — „Не красамоўствам, а справай“, М —„Удзел ко самотнаў забясьпечаў“, Ударнікам — „Уборачная кампанія не праходзіць міма нас“, Дзяргачову — „Праверыць хто вінаваты“, Зіснаву—„Добры пачын“, ...бану—„Даёш сілос“, Каплану—„...самоз за сілос“, Чубару—„Пр... забыліся“, М-ка — „Зусім ...удзел у працы“, Ул. Гунько — ...лос не поўным зрыве“, К. Л... „Сілосную яму не падрыхто...юць“, Бэйлінсону і Джэв шкаму—...сілосаваньні і аб комсамольцах к...кай с-г школы“, Стар. Колгасу—...рыцкая комсамольская ячэйка ў ...ходзе за сілос“, Бядуленку—„Сі...ваньне ў Бялыніцкім р-не“, Зорка... „Аўладалі ўдарнымі тэмпам.“, Л... „Пакончыць з расхлябанасьцю“, ...тракову—„Програма па сілосу ...веецца“, Завалкову—„Б'ем трыв...“, А. Мяцеліцы—„Чуць не забылі...“, Доўгапольскаму—„Няма д...зоч...аць вы“, Лявіцкаму—„Яшчэ сы...“, Завалкову—„Загатаўленьне сіла...“, Ганштаў праходзіць пасьпяхова“, Сталёвыму — „Сыгналы не пачу...“, Д. Л.—„На распрацоўку ...сельска-гаспадарчай літаратуры забылі...“, Навальніцы — „Устань хоць у ... уборачнай кампаніі“, Лявіцкаму— „Агулам дапамагаюць, але ...не“, Р. Малятку—„Уборку закон... пасьпяхова“, Невядомаму — „Ко... „Комунар“ замацоўвае свае ш... перадавічныя дописы зьмяшчаны... будуць.

Паведамленьні

5-га кастрычніка, а 7-ай гадз. увечары, у памяшканьні Дому Пісьменьніка адбудуцца заняткі Цэнтральнай літаратурнай рабочай студыі БелАПП'у.

Яўка ўсіх сяброў студыі абавязкова. Могуць прысутнічаць жадаючыя.

Бюро студыі.

У часе працы конфэрэнцыі ўдарнікаў і рабочай моладзі будзе адкрыта выстаўка экспонатаў ...якасьці продукцыі і браку. ...кам ЛКСМБ зьмясьціць мат... для экспонатаў. Мастацкі афор... дошкі павінны самі яч. Прыно... 6-га, ні ў якім разе не пазь... 4-ай гадз. дня, у клюб і... Маркса. Здаваць т. Рамановс...

ФРК ЛКСМ...

ВАЖАТЫ АТРАДУ, ФАРПОСТУ, УВАГА!

ЦБ ДКА і БЕЛРАДЫЁЦЭНТР склікаюць агульна-гарадзкую ...фэрэнцыю радыё-слухачоў, радыёкарэспондэнтаў, радыё-аматараў ...есе з актывам піонэраў і школьнікаў па пытаньню:

організацыі работы вакол радыё ў атрадзе і школ...

Конфэрэнцыя адбудзецца 4-га верасьня, ў Доме Асьветы (Ко...містычная вул., 19). Пачатак а 6-ай гадзіне. Табе неабходна забясь...чыць своечасовую яўку актыву. Прысутнасьць піонэр-працаўнікоў конфэрэнцыі абавязкова.

Адказны рэдактар—Рэдколег...

Па Савецкай Беларусі

Пад пагрозай зрыву

Сілосаваньне ў Лельчыцкім раёне знаходзіцца пад пагрозай зрыву. Некаторыя комсамольскія ячэйкі як то колгасаў: „Адказ ворагам“, „Бальшавік“ і Сетынская яч. пра якія ўжо не раз пісалася ў друку бездакорна адносяцца да сілосу. Тыхіх ячэек ніякія сыгналы не трывожаць. Трэба падкрэсьліць, што за апошні час, як райком КП(б)Б, так і проф. організацыі аддалі ўвагу сілосаваньню, Райком партыі высунуў такі лёзунг:—Кожны масцком павінен выкапаць адну сілосную яму. Гэты лёзунг падхоплен, але не ўсімі масцкомамі.

Па раёну ўсяго па плану вызначана засіласаваць 7.052 тоны, засілосавана-ж на сёньняшні дзень толькі 133 тоны, што складае 1,89 проц. заданьня. Гэта лічба яскрава сыгналізуе аб зрыве сілосаваньня.

Па раёну прыгатавана 11 ям ёмкасьцю на 415 тон, якія зараз-жа патрэбна засілосаваць.

З рашучасьцю і настойлівасьцю змагацца за выкананьне намечаных планаў па сілосаваньню кармоў,—такая задача перад Лельчыцкага р-ну.

А. Кароль.

Датэрміновым выпускам прыкрываюць сваю бяздзейнасьць

Спачатку у Віцебскі фабзавуч панчошнікаў меркавалася набраць 70 чалавек. Але раптам адміністрацыя зьменшыла разьвёрстку да 40 чалавек з тае прычыны, што нібы не хапае варштатаў.

Няўзабаве, для таго, каб прыкрыць сваю бяздзейнасьць у справе наладжваньня работы фабзавучу і складаньня ўмоў і магчымасьцяй для набору 70 чалавек, адміністрацыя знаходзіць „выхад“,—робіць датэрміновы выпуск. Калі ўлічыць, што вучні, якіх думае зараз выпускаць адміністрацыя знаходзяцца ў школе ўсяго па 2-3 месяцы, дык зробіцца зразумелым нікчэмнасьць гэтага выпуску.

Трэба патрабаваць ад адміністрацыі фабрыкі большай адказнасьці за работу ФЗВ.

Ш. Г.

2 гадзіны прастаяў цэх па віне Цьвятковіча

22 верасьня ў карамельным цэху ф-кі „Комунарка“ на 3-й зьмене, па віне старшага майстра Цьвятковіча, быў двухгадзінны прастой.

Цьвятковіч, каб прыняць увесь прывезены цукер, прыняў толькі частку, а рэшту адправіў на склад, быццам не было месца дзе пакласьці. А ведаў, Цьвятковіч, што ўначы склад зачынен.

Такім чынам 3-яя зьмена не хапіла цукру. Гэты факт прайшоў міма ўвагі адміністрацыі і комсамольскай ячэйкі. Трэба прыцягнуць да адказнасьці Цьвятковіча, работа якога накіравана на зрыў промфінплану.

Пост „Чырвонай Зьмены“

Субач.

Засілосавалі 13 ям

Плешчаніцы, 29. (Па тэлефону ад нашага юнкора). Пяддаўна ў газэце „Чырвоная Зьмена“ быў зьмешчан шэраг матар'ялаў аб тым, што па Плешчаніцкаму раёну зрываецца сілосаваньне. На гэтых матар'ялах прыняты рашучыя захады.

На 20 закончана сілосаваньне 13 ям. Заданьне па сілосаваньню будзе выканана.

Восьмы ідзе

Мэдагляд на менскім пункце прызыўнікоў 1908 г.

„Чырвоная Зьмена“ дапамагла

Колегія Мазырскай АКК РСІ паведамляе, што зьмешчаны у „Чырвонай Зьмене“ допіс пад назвай „Пэдагог разьлагальнік“ пры разборы падцьвердзіўся.

Выкладчык—агроном Ракаў зьняты з працы.

* * *

Сьмілавіцкі РВК паведамляе, што допіс „У савецкіх установах сям'я Фрыдланд“ цалкам падцьвердзіўся.

Фрыдланд Валя з працы зьнята. Адносна бацькі Фрыдланд прэзыдыум РВК паставіў пытаньне перад Белдзяржтэатрам аб зьняцьці яго з працы.

* * *

Любанскі РК КП(б)Б паведамляе: „Заметка аб разгільдзяйстве Забалоцкага, зьмешчаная ў „Ч. З.“ № 930, цалкам падцьвердзілася.

Забалоцкі зьняты з працы, як неадпаведаючы свайму прызначэньню.

* * *

Смалявіцкі РК КП(б)Б паведамляе, што допіс „Вон з комсамолу п'яніц“ падцьвердзіўся.

Ляўдзіцкі выключан з шэрагаў комсамолу.

* * *

Гомельскі РК КП(б)Б паведамляе, што заметка „Офіцэр колгас пачысьціў“ падцьвердзілася.

Шыцікоў зьняты з працы сэкратара парт. ячэйкі, атрымаў вымову і прыцягваецца да судовай адказнасьці.

* * *

Заслаўскі РВК паведамляе, што заметка пад назвай „Пад музыку працуюць“ цалкам падцьвердзілася.

Старшыня сельсавету зьняты з працы.

* * *

Белкоопсаюз паведамляе, што па заметцы нашага юнкора Капыльскі райкоопсаюз прыцягваецца да судовай адказнасьці. Кладаўшчык—Буйноўскі з працы зьняты і аддаецца пад суд.

* * *

Па заметцы „Мы б'ем тривогу“, зьмешчанай у „Чырвонай Зьмене“, менскі Комгас паведамляе, што заметка падцьвердзілася.

Пастанова аб адміністрацыйным спагненьні адменена.

* * *

Райінспэктарыят Самахвалавіцкага раёну, у адказ на дасланыя туды заметкі нашага юнкора пад назвай „Заява“ і „Нам непатрэбны такія настаўнікі“, адказвае: „факты ў асноўным падцьвердзіліся. За што настаўніку Альшкевічу А. Я. вынесена вымова“.

* * *

Копыльскі РК КП(б)Б паведамляе, што заметка „Не відзенна ніякай працы сярод беднаты і батракоў“ расьсьледаваньнем падцьвердзілася, за што т. Габрыелю абвешчана вымова.

* * *

Барысаўскі інспэктарыят Аховы Працы паведамляе, што заметка аб Зелембінскай арцелі „Чырвоны Молат“ падцьвердзілася. Па матар'ялах заметкі адміністрацыя арцелі прыцягнута да адміністрацыйнай адказнасьці— штрафу.

Згублены

Ком. біл. за № 116239, на імя Баранкова Ул., выд. Маз. Акр. ЛКСМБ.

Ком. біл. за № 34326, на імя Карбановіча С., выд. Мен. АК ЛКСМБ.

— Ком. біл. за № 13226, на імя Белінвіч И., выд. Заслаўскім РК ЛКСМБ.

— Ком. біл. за N. 117384, на імя Канаваліва Міколы, выд. Магіл. Акр. ЛКСМБ.

— Ком. біл. за № 77238, на імя Стасевіча А. І., выд. Аршанскім Акр. ЛКСМБ.

— Ком. біл. за № 135519 на імя Клянко Ц. Ц., выд. Мен. Акр. ЛКСМБ

— Ком. біл. за № 51519, на імя Алешкавай А. І., выд. Наб.—Чэлябінскім кантконам Ус ЛКСМ (Татарская Рэспубліка).

— Ком. біл. за № , на імя Барысенка А. К., выд. Аршанскім акр. ЛКСМБ.

— Ком. біл. за № 138958, на імя Суська В. Т., выд. Акр. ЛКСМБ.

— Ком. біл. за № 63, на імя Пераль М. А., выд. Мен. Акр. ЛКСМБ.

— Ком. біл. за № 71947, на ...Гарбуз Л. К., выд. Мен. Акр. ЛКСМБ.

— Дублікат ком. пасьведч. №11... на імя Муха Я. Н., выд. Мен. ЛКСМБ.

— Ком. біл. за №135695, на Плыначэўскага В. Я., в д. Мен. ЛКСМБ.

— Ком. біл. за № 112444, на Аляксандровіча З. І., выд. Мен. ЛКСМБ.

— Ком. біл. за № 54123 на ім...бакова Л. М., выд. Мен. Акр. ЛК...

— Ком. біл. за № 122810, на Пятроўскай Я. П., выд. Мен. ЛКСМБ.

— Ком. біл. за №48571, на ім...даса І. М., выд. Мен. Акр. ЛКС...

— Ком. біл. за № 87089, на ...фрымо У. М., выд. Мен. Акр. ЛК...

— Ком. біл. за № 71139, на Кафрыга Я. Р., выд. Мен. Акр. ЛК...

— Ком. біл. за № 71718, на Станкевіч У. Ф., выд. Мен. ЛКСМБ.

— Ком. біл. за № 85465, на Нозвін А. М., выд. Віцебск. ЛКСМБ.

Менск, друкарня БДВ імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 59...